Трэцяя зала — “Беларускае ткацтва”. Яна аформлена ў два ярусы.

У ніжнім ярусе размешчаны экспанаты, якія дазваляюць расказаць і паказаць працэс ткацтва і апрацоўкі льну. Гэта саха, барана, сявенька, церніца, грабяні, пранікі, трапала, матавілы, верацёны, прасніцы, калаўроты, кросны...

У верхнім ярусе прадстаўлены непаўторныя тканыя вырабы: ручнікі, абрусы, пасцілкі...

За той кароткі час, калі пачаў стварацца этнаграфічныя экспазіцыя “Вытокі”, экспазіцыйна-выставачная частка налічвае звыш 500 экспанатаў. Экскурсаводамі працуюць навучэнцы 1 - 3 курсаў. Наша пошукавая, даследчая, навуковая праца працягваецца. Работа па стварэнню музея і яго папаўненні, стала калектыўнай справай усіх майстроў, выкладчыкаў, навучэнцаў, бацькоў і ўсіх работнікаў нашай навучальнай установы.

Пры экспазіцыі працуюць 2 гурткі: “Музейная справа” і “Літаратурнае краязнаўства”



*“Пасля гадоў духоўнага шцьмення*
*Мы да вытокаў згубленых прыйшлі”*
*З. Марозаў*

# ЭТНАГРАФІЧНЫЯ
## экспазіцыя

## “ Вытокі”

Наш адрас:
211440, Віцебская вобласць, г. Наваполацк, в. Ктатарава, д.20.
т. 8(0214)53-79-43

Этнаграфічныя экспазіцыя “Вытокі” была заснавана ў 2006 годзе. Агульная плошча памяшкання, дзе знаходзяцца экспазіцыі, складае 140 квадратных метраў.

Хто не дбае свайго, не цэніць і чужога. Гэтая народная мудрасць прыдатна і ў дачыненні да свайго, нацыянальнага, з аднаго боку, і “чужога”, іншаэтнічнага - з другога. Толькі праз нацыянальнае можна спасцігнуць агульначалавечае.

Выхаванне патрыятызму і грамадзянскасці немагчыма без разумення таго, хто мы такія, як народ, чым адрозніваемся ад іншых народаў, што ў нас агульнага, чым можам ганарыцца, а ад чаго павінны пазбавіцца.

Знаёмства з гісторыяй выклікае жаданне зберагчы спадчыну, больш даведацца пра мінулыя пакаленні, іх духоўную і матэрыяльную культуру. “У падзеях мінулага - нашы карані”, - гаварыў У. Караткевіч.

Для таго, каб пазнаёміцца з нашымі каранямі і пачалася работа па стварэнню ў нашай навучальнай установе этнаграфічнай экспазіцыі. Наша задача сабраць, захаваць і пайсці далей “са спадчынай продкаў у будучыню”.

Наведаўшы сваіх бабуль і дзядуль у вёсках, навучэнцы пачалі прывозіць прадметы сялянскага побыту і хатняга ўжытку, прылады працы для ткацтва і апрацоўкі льну і звесткі аб іх. Былі праведзены этнаграфічныя экспедыцыі па роднаму краю, якія папоўнілі музей новымі экспанатамі. Прывезеныя разнастайныя рукатворныя рэчы - гэта ўвасабленне не толькі працоўнага, а і творчага працэсу, які адлюстроўвае пэўныя традыцыі і дае нам каштоўную інфармацыю пра тое, як жылі нашы продкі, што рабілі, пра іх духоўныя інтарэсы, эстэтычныя густы, народныя веды, майстравыя навыкі.

Першая зала “Інтэр’ер беларускай хаты” расказвае пра прыгажосць і ўтульнасць беларускай хаты 1-й паловы XX ст. У ёй усе рэчы патрэбныя І займаюць сваё месца. Гэта печ злева, як сімвал жыцця. Далей спальны куток, з люлькай для дзіцяці, ложак, прыбраны саматканай посцілкай і маляваным дываном.

Потым покуць - самае пачэснае месца - з абразамі над хатнім небам. Тут стаіць стол, лавы, вокны з выбіванымі фіранкамі. Да столі падвешаны павук - упрыгожванне з саломкі, сімвал дабрабыту і шчасця.

Насупраць печы - “бабін кут” (паліца з разнастайным посудам). У сенцах знайшлося месца для прылад працы (жорны, ступа) Кампазіцыя ў першай зале дапаможа педагогам пры вывучэнні роднай мовы, літаратуры, гісторыі нашага краю, дазволіць праводзіць нестандартныя ўрокі, лекцыі, экскурсіі, дапаможа навучэнцам вывучаць і зразумець той час, у якім жылі нашы продкі.

Другая зала прадстаўляе экспазіцыю “Вышыўка”. На выставе сабраны рэчы з вышыўкай гладдзю і крыжыкам.



Вышыванню заўсёды спадарожнічалі цярплівасць, працавітасць. Вышыўка давала ўрокі акуратнасці, вучыла ўважлівасці, густу. Усё гэта мы і стараемся выхоўваць у нашых навучэнцаў.